УДК 069.1+069.8(476)

# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ФУНКЦЫІ МУЗЕЯ: АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ Ў ПОСТСАВЕЦКІ ПЕРЫЯД

***І. І. Бамбешка,*** *кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле здзейснены гістарыяграфічны аналіз публікацый, прысвечаных вывучэнню сацыяльнага прызначэння музея, яго сацыякультурных функцый. Храналагічныя межы даследавання: пачатак 1990-х – 2020-я гг. Крыніцамі даследавання паслужылі публікацыі айчынных аўтараў, сярод якіх пераважалі дысертацыі на саісканне ступені кандыдата навук, артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных выданнях і зборніках канферэнцый. Вывучэнне акрэсленых работ дазволіла канстатаваць, што, грунтуючыся на замежным (пераважна расійскім) вопыце, айчынныя аўтары спрабуюць прадставіць уласнае бачанне сацыякультурных функцый музея незалежна ад яго профілю ці віду.

**Ключавыя словы:** музей, сацыяльнае прызначэнне музея, сацыякультурныя функцыі музея, постсавецкі перыяд, Беларусь.

# SOCIO-CULTURAL FUNCTIONS OF THE MUSEUM: BELARUSIAN HISTORIOGRAPHY IN THE POST-SOVIET PERIOD

***I. Bambeshka,*** *PhD in Cultural Studies, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article provides a historiographical analysis of the publications of Belarusian researchers devoted to the study of the social purpose of the museum, its sociocultural functions. Chronological boundaries of the study: early 1990s – 2020s. The sources of the research were the publications of domestic authors, among which the dissertations for the PhD degree, articles in scientific peer-reviewed publications and conference proceedings prevailed. The study of the indicated works made it possible to state that, relying on foreign (mainly Russian) experience, domestic authors are trying to present their own vision of the socio-cultural functions of the museum, regardless of its profile and type.

**Keywords:** museum, social purpose of the museum, sociocultural functions of the museum, post-Soviet period, Belarus.

Актыўнае развіццё музеяў і музейнай справы на мяжы стагоддзяў стымулюе і развіццё навуковай рэфлексіі. Тэарэтыкаў і практыкаў музейнай справы хвалюе пытанне аб сутнасці музея, якое цесна звязана з вызначэннем яго сацыякультурных функцый. Рэтраспектыўны аналіз музеялагічнай літаратуры, дзе закраналіся пытанні функцыянавання

музея ў грамадстве, сведчыць пра тое, што аўтары часцей карыстаюцца тэрмінам «сацыяльныя функцыі музея». Аднак, на наш погляд, больш карэктна будзе выкарыстоўваць словазлучэнне «сацыякультурныя функцыі», паколькі, як слушна адзначаюць прыхільнікі «крытычнай музеялогіі», дзейнасць музея дэтэрмінавана сацыякультурнымі абставінамі.

Шырокі спектр інтэрпрэтацый музея, дынаміка яго развіцця сведчаць аб культурнай значнасці апошняга, узнікненне і функцыянаванне якога ў сацыякультурным асяроддзі адрозніваецца ад іншых з'яў культуры. Гэта адрозненне заключаецца ў захаванні і прадстаўленні прадметаў, прычым рэчаў арыгінальных, аўтэнтычных. Аўтэнтычная рэч процістаіць віртуальнасці, мастацкаму вобразу і сімулякру. Менавіта аўтэнтычнасць музейнага прадмета, які валодае гістарычнай, мемарыяльнай, навуковай і мастацкай каштоўнасцю, надае музею ўнікальнасць і своеасаблівасць. Музей як сукупнасць аўтэнтычных прадметаў у эпоху татальнай віртуальнасці застаецца, бадай, адзінай інстытуцыяй, здольнай даць наведвальніку магчымасць адчування рэальных перажыванняў. Асаблівасцю музейнага прадмета з'яўляецца тое, што, трапляючы ў музей, ён вырываецца з кантэксту свайго бытавання і адначасова становіцца яго сімвалам і знакам; процістаіць фрагментарнасці ведаў і дае сістэмнае і адносна поўнае ўяўленне аб мінулым. У гэтым сэнсе музей паўстае як спецыфічная форма пэўных сацыякультурных адносін, як складаная сістэма, што развіваецца, здзяйсняючы пэўныя сацыякультурныя функцыі.

Праблема сацыякультурных функцый музея мае даўнюю гісторыю. Неабходнасць асэнсавання сацыяльнага прызначэння музея ўзнікла на тым этапе яго развіцця, калі прадметы, адабраныя з акаляючага прыроднага ці сацыяльнага асяроддзя, сталі захоўвацца не па прычыне сваёй матэрыяльнай каштоўнасці і ўтылітарнай карысці, а як сведчанне знакавых падзей, як падцвярджэнне прыналежнасці ўладальніка прадметаў пэўнаму роду, для задавальнення эстэтычных патрэб і інш.

Пытанне грамадскага прызначэння музея шырока абмяркоўвалася ў расійскай гістарыяграфіі, у т. л. і ў постсавецкі перыяд. Расійскімі даследчыкамі назапашаны значны інтэлектуальны вопыт у акрэсленай сферы. Што датычыцца айчыннай музеялогіі, то ў беларускай гістарыяграфіі да апошняга часу праблема сацыякультурных функцый музея ніколі не была аб'ектам маштабных навуковых дыскусій ці значных тэарэтычных разваг, аб чым сведчыць нязначная колькасць публікацый. Падобную сітуацыю можна растлумачыць, па-першае, пачатковым станам ўласнабеларускай музеялогіі; а па-другое, цеснай сувяззю з савецкай і расійскай музеалагічнай навукай. Айчынныя даследчыкі актыўна карыстаюцца навуковай спадчынай А. М. Разгона, Д. А. Равіковіч, Ю. П. Пішчуліна, А. М. Масценіцы і інш. У той жа час у апошнія гады з'явіліся публікацыі, якія закранаюць пытанні сацыякультурных

функцый музея і аўтары якіх прадстаўляюць дастаткова шырокі спектр меркаванняў у акрэсленай галіне.

Адзін з першых артыкулаў у постсавецкай беларускай музеалагічнай навуцы, прысвечаны праблеме сацыякультурных функцый музея, быў апублікаваны ў 1993 г. тагачасным супрацоўнікам Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка Г. П. Ладзісавай. Пазіцыя аўтара поўнасцю супадае з пунктам гледжання савецкай і расійскай даследчыцы Д. А. Равіковіч. Г. П. Ладзісава сярод галоўных сацыякультурных функцый музея называе функцыі дакументавання, адукацыі і выхавання і функцыю арганізацыі вольнага часу [5, с. 18]. Тых жа пазіцый прытрымліваецца і А. Р. Мацевасян, якая ў сваіх артыкулах 2003 і 2007 гг. не толькі пералічыла асноўныя сацыякультурныя функцыі беларускіх музеяў (дакументавання, адукацыі і выхавання, арганізацыі вольнага часу), але і паспрабавала акрэсліць асноўныя тэндэнцыі развіцця музеяў у межах іх сацыяльных функцый [8; 9].

У 1999 г. у Рэспубліцы Беларусь з'явілася выданне «Музейны дыярыуш, ці Уваходзіны ў новую музеялогію», якое ўяўляла сабою першы прыклад беларускамоўнага падручніка па музеязнаўству. У ім раскрываліся базавыя паняцці музеялогіі і давалася характарыстыка асноўных накірункаў музейнай дзейнасці. Яго аўтарам быў вядомы беларускі музеязнавец А. М. Калбаска. Грунтуючыся на пазіцыі А. А. Разгона і спасылаючыся на вучэбны дапаможнік 1988 г. «Музеязнаўства. Музеі гістарычнага профіля», аўтар абсалютна слушна заўважаў, што месца музея ў сацыяльным асяроддзі вызначаецца яго сацыяльнымі (сацыякультурнымі. – *І. Б.*) функцыямі – тымі задачамі і патрабаваннямі, якія грамадства перад ім ставіць і прад'яўляе да яго. Таму А. М. Калбаска, акрамя функцыі дакументавання, дадае яе складаючыя – даследчую і ахоўную функцыі. Таксама ён вылучыў функцыі адукацыі і выхавання, але апусціў функцыю арганізацыі вольнага часу [4, с. 11].

Можна сцвярджаць, што згаданыя айчынныя аўтары (Г. П. Ладзісава, А. М. Калбаска, А. Р. Мацевасян) з'яўляюцца прыхільнікамі сацыякультурнага падыходу ў вызначэнні сацыякультурных функцый музея.

Спалучэнне сацыякультурнага і культуралагічнага падыходаў праяўляецца ў артыкуле, а затым і ў кандыдацкай дысертацыі І. Г. Лупашка. Грунтуючыся на пазіцыях савецкіх музейных тэарэтыкаў і практыкаў А. М. Разгона, Ю. П. Пішчуліна, Д. А. Равіковіч, З. А. Бонамі, даследчыца ў сваіх развагах аб сацыякультурных функцыях літаратурных музеяў, акрамя функцый дакументавання, адукацыйна-выхаваўчай (аўтар раз'ядноўвае гэту функцыю і падае іх асобна як адукацыйную і выхаваўчую) і дасугавай (арганізацыі вольнага часу), вылучае камунікацыйную і аксіялагічную функцыі [6, с. 27]. Па меркаванні І. Г. Лупашка, літаратурны музей выступае як медыятар, пасрэднік паміж наведвальнікамі і літаратарамі, пратапытамі і героямі іх твораў, ранейшымі чытачамі. Сваю думку аўтар падцвярджае меркаваннямі

вядомага расійскага музеязнаўцы З. А. Бонамі, якая адзначала, што «камунікацыя ў літаратурным музеі – гэта метакамунікацыя (другасная) ў адносінах да менавіта літаратурнай – працэсу зносінаў праз друкаваны тэкст, які ўзнікае ў аўтара з яго чытачом насля апублікавання мастацкага твора» [3, с. 327]. Што датычыцца аксіялагічнай функцыі, то, па меркаванні аўтара артыкула, у літаратурным музеі адбываецца не толькі «далучэнне наведвальнікаў да агульначалавечых каштоўнасцей», але і фарміраванне «эстэтычнага эталона», важнага як для ўспрыняцця класічнай літаратуры, так і сучаснай. Такім чынам, наведвальнік мае магчымасць параўноўваць уласнае ўспрыняцце літаратурнага твора з агульнапрынятым [6, с. 27]. Праз некалькі гадоў у дысертацыйным даследаванні І. Г. Лупашка прадставіла больш шырокую карціну сацыякультурных функцый літаратурнага музея. Перш за ўсё аўтар не толькі пашырыла спектр сацыякультурных функцый музея за кошт далучэння інтэрпрэтацыйнай функцыі, але і прадставіла іх на двух узроўнях. На першым музей рэалізуе традыцыйныя функцыі (дакументавання, адукацыйна-выхаваўчую, аксіялагічную, інтэрпрэтацыйную, камунікатыўную, рэкрэацыйную) праз асноўныя кірункі дзейнасці. Другі ўзровень, ці мэтафункцыі, адпавядае грамадскаму прызначэнню музея, а канкрэтна: «удзел у працэсе непарыўнага развіцця культуры, <…> забеспячэнні бесперапыннасці трансляцыі культурных традыцый і пераўтварэнне музея ў месца міжкультурнага ўзаемадзеяння» [7, с. 40–41, 111]. Трэба адзначыць, што ў айчынным музеязнаўчым дыскурсе гэта быў першы вопыт такога падрабязнага аналізу сацыякультурных функцый музея з пазіцыі не толькі музеялогіі, але і культуралогіі. Аўтар не толькі акрэсліла функцыі літаратурнага музея, якія з пэўнымі карэктыроўкамі могуць вызначацца як функцыі музея ўвогуле, без акцэнтуацыі на профільнай прыналежнасці, але і паспрабавала сфармуляваць сверхзадачу музея, паколькі другі ўзровень сацыякультурных функцый – гэта не што іншае, як місія музея.

Звяртае на сябе ўвагу артыкул «Музей як прастора трансфармацыі сацыяльнага» тагачаснага супрацоўніка Вілейскага краязнаўчага музея К. І. Сушко, у якім аўтар, грунтуючыся на меркаваннях амерыканскага мастака нямецкага паходжання, вядомага крытыка сучасных музеяў Х. Хааке і разважаючы аб ролі музея ў сучасным грамадстве, прапануе ўласнае бачанне гэтай праблемы. Яна вылучае функцыі дакументавання (якая гучыць як «зварот да спадчыны мінулага, яго захаванне і дэманстрацыя»), адукацыі і выхавання, мадэліравання і канструіравання рэчаіснасці [10, с. 13]. Вылучэнне апошняй функцыі, па меркаванні аўтара, абумоўлена зменамі ў сацыякультурнай сітуацыі, якая ўскладае на музей «задачы фарміравання генерацыі людзей». Асноўным сродкам рэалізацыі названай функцыі з’яўляецца экспазіцыйна-выставачная дзейнасць, падчас якой адбываецца «канструіраванне нацыянальнай ідэнтычнасці» (ці «пабудова канструкту нацыянальнай індэнтычнасці») і ў выніку –

«асоба наведвальніка пераўтвараецца ў паўнавартаснага грамадзянскага суб’екта» [10, с. 15]. На нашу думку, аўтар, адзначаючы ролю музея ў выхаванні (ці канструіраванні) нацыянальнай ідэнтычнасці, безумоўна мае рацыю, тым больш, што шматлікія даследчыкі ў апошнія гады актыўна вылучаюць падобную функцыю. Аднак у яе разважаннях ёсць некаторыя недакладнасці. Па-першае, нават нягледзячы на наяўны практычны музейны вопыт, аўтар не валодае адпаведнай музеязнаўчай тэрміналогіяй, паколькі функцыю, якая характэрна для музейнага прадмета, пераносіць на сам музей. Па-другое, «мадэліраванне і канструіраванне рэчаіснасці» – гэта не зусім фарміраванне ідэнтычнасці.

Сацыякультурныя функцыі рэгіянальных музеяў (у параўнанні з іншымі ўстановамі культуры – бібліятэкамі і клубамі) сталі аб’ектамі навуковай рэфлексіі даследчыцы С. Л. Шпарло [12]. Адштурхоўваючыся ад меркаванняў сучасных тэарэтыкаў і практыкаў музейнай справы, аўтар абсалютна слушна адзначае шырокі дыяпазон сацыякультурных функцый музея і вылучае функцыі дакументавання, асветы, выхавання, адукацыі, вывучэння, культурастварэння і камунікацыі. Прычым аўтар артыкула настойвае на адасабленні функцыі асветы ад функцыі выхавання і адукацыі, адзначаючы, што асветніцтва мае больш індывідуальны характар [12, с. 40–41]. Працягваючы свае разважанні ў кандыдацкай дысертацыі, С. Л. Шпарло канстатуе, што рэагіянальныя музеі выконваюць як базавыя функцыі дакументавання, адукацыі і выхавання, функцыю арганізацыі вольнага часу, так і ўласцівыя толькі ім, да якіх можна аднесці функцыю трансляцыі культуры рэгіёна, скіраваную менавіта на захаванне культурнай ідэнтычнасці мясцовай супольнасці, аксіялагічную (садзейнічанне станаўленню асобы, якая ўсведамляе сваю прыналежнасць да пэўнай этнічнай групы), эканамічную (садзейнічае эканамічнаму развіццю рэгіёна) і рэгіёнапрадстаўнічую [11, с. 55].

Намі таксама была здзейснена спроба прааналізаваць сацыякультурныя функцыі краязнаўчага музея спачатку ў межах навуковага артыкула, а потым дысертацыі. На старонках артыкула мы прыйшлі да высновы, што «краязнаўчы музей як гістарычна абумоўлены інстытут сацыяльнай памяці, <…> выконвае такія ж функцыі (дакументавання, адукацыі і выхавання і рэкрэацыйную), што і астатнія музеі. Аднак своеасаблівасць краязнаўчага музея накладае адбітак і абумоўлівае спецыфічнасць пералічаных функцый» [2, с. 25]. Больш шырока і падрабязна наша пазіцыя была прадстаўлена ў кандыдацкай дысертацыі. Здзейснены аналіз дынамікі развіцця краязнаўчых музеяў дазволіў удакладніць змест яго сацыякультурных функцый і разгледзець іх на двух узроўнях. Першы ўзровень – інтрасістэмны – складаюць наступныя сацыякультурныя функцыі: дакументавання, адукацыі і выхавання, арганізацыі вольнага часу, якія атаясамліваюцца з практычнымі кірункамі дзейнасці краязнаўчага музея і забяспечваюць функцыянаванне яго як сістэмы. На другім, экстрасістэмным, узроўні можна

вылучыць функцыі сацыякультурнай памяці, сацыякультурнай рэфлексіі, сацыякультурнай камунікацыі, сацыякультурнай адаптацыі і сацыякультурнага праектавання, якія вызначаюць ролю і месца музея ў сацыякультурным асяроддзі, фарміруюць сэнс яго існавання на дадзеным гістарычным этапе. Таксама былі выяўлены і характэрныя рысы сацыякультурных функцый краязнаўчага музея: іх канстантнасць і дынамічнасць [1, с. 124–125].

Падводзячы вынікі, адзначым, што ў 1990–2020-я гг. у айчыннай музеялогіі з'явіўся шэраг публікацый, якія акцэнтавалі ўвагу на сацыяльным прызначэнні музеяў і іх сацыякультурных функцыях. Адштурхоўваючыся ад прац савецкіх і замежных даследчыкаў, аўтары не толькі вылучалі традыцыйныя функцыі музеяў, аналізавалі практыку рэалізацыі іх музеямі, але і спрабавалі выявіць спецыфіку функцый у дачыненні да музеяў розных профіляў і відаў, а таксама прадставіць іх іерархію, вылучаючы функцыі першага і другога ўзроўня.


1. *Бамбешка, І. І.* Культурна-адукацыйная дзейнасць краязнаўчых музеяў Беларусі па актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны : дыс. … канд. культуралогіі : 24.00.03 / І. І. Бамбешка. – Мінск, 2021. – 184, [5] л.

2. *Бамбешка, І. І.* Спецыфіка сацыяльных функцый краязнаўчага музея / І. І. Бамбешка // Культура Беларуси: реалии современности : VII Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. Году малой родины в Респ. Беларусь, Минск, 4 окт. 2018 г. : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: А. А. Корбут [и др.]. – Минск, 2018. – С. 23–27.

3. *Бонами, З. А.* Литературный музей и общество / З. А. Бонами // Музеи мира : [сб. науч. тр.] / Рос. акад. наук, Науч.-исслед. ин-т культуры ; отв. ред. Е. Е. Кузьмина. – М., 1991. – С. 327–335.

4. *Калбаска, А. М.* Музейны дыярыуш, ці Уваходзіны ў новую музеялогію / А. М. Калбаска. – Мінск : БелІПК, 1999. – 148 с.

5. *Ладисова, Г. П.* Социальные функции и типология музеев / Г. П. Ладисова // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў запаведніка па выніках працы : навук.-практ. канф. 1991, 1992 гг. / Полацкі гіст.-культур. музей-запаведнік. – Полацк, 1993. – С. 17–19.

6. *Лупашка, І. Г.* Сацыяльныя функцыі літаратурнага музея / І. Г. Лупашка // Вестн. молодеж. науч. о-ва. Спецвып. : Культура Беларуси в XXI в. – 2003. – С. 27–28.

7. *Лупашка, І. Г.* Функцыянаванне беларускіх літаратурных музеяў у кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў : дыс. … канд. культуралогіі : 24.00.03 / І. Г. Лупашка. – Мінск, 2013. – 163, [11] л.

8. *Матевосян, Е. Р.* Основные направления и формы работы белорусских музеев в рамках и социальных функций / Е. Р. Матевосян // Музеи Литвы и Беларуси: пути и перспективы развития в XXI в. : материалы конф., Минск – Вильнюс – Тракай, 2006–2007 / сост.: Е. Матевосян, В. Повилюнас, А. Сташкевич. – Минск, 2007. – С. 52–57.

9. *Мацевасян, А. Р.* Развіццё сацыяльных функцый беларускіх музеяў / А. Р. Мацевасян // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2003. – № 2. – С. 127–131.

*10. Сушко, Е. И.* Музей как пространство трансформации социального / Е. И. Сушко // Музеі і патрыятычнае выхаванне : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 28 лістап. 2012 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (старш.), А. М. Нароўская, Л. С. Скакун. – Мінск, 2013. – С. 12–17.
*11. Шпарло, С. Л.* Трансляция историко-культурного наследия в условиях интеграции деятельности региональных учреждений культуры Республики Беларусь : дис. … канд. культурологии : 24.00.03 / С. Л. Шпарло. – Минск, 2020. – 186, [3] л.
*12. Шпарло, С. Л.* Функции и формы деятельности музеев, библиотек, домов культуры: общее и особенное / С. Л. Шпарло // Искусство и культура. – 2020. – № 1. – С. 39–42.